# КРЫЗІС ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКАЙ СІСТЭМЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

***Забаўскі М.М., прафесар, БГПУ, г. Минск***

У пачатку XIX ст. Расійская імперыя ўяўляла сабой магутную краіну з тэрыторыяй каля 17 млн квадратных кіламетраў і насельніцтвам амаль 40 млн чалавек. Велізарная плошча ў спалучэнні з эканамічнай і этнічнай разнастайнасцю вызначалі і асаблівасці развіцця рэгіёнаў. Так, Еўрапейская Расія знаходзілася на парозе капіталізму, у той час як народы Сібіры і Далёкага Усходу захоўвалі яшчэ патрыярхальна-родавы ўклад. Па большасці эканамічных паказчыкаў Расія ўступала еўрапейскім краінам, паколькі галоўным тормазам у гэтым з'яўлялася прыгонніцтва.

Тэрыторыя Беларусі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. увайшла ў Пскоўскую (1772–1776 гг.), у 1776–1796 г. у Полацкую і Магілёўскую (1772–1796 гг.) губерні. У 1793 г. далучылася Мінская (1793–1921 гг.) губерня. Пасля трэцяга падзела РП у 1795 г. былі створаны, акрамя Мінскай губ., спачатку Слонімская (1796–1797 гг.) і Віленская (1795–1797 гг.), а затым Беларуская (1796–1802 гг.) і Літоўская (1797–1801 гг.) губерні.

З 1802 г. тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў губерні: Мінскую (1793–1921); Гродзенскую (1801–1920), да яе ў 1843 г. была далучана Беластоцкая вобласць, якая адыйшла да Расіі ў 1807 г.; Магілёўскую (1802–1919); Віцебскую (1802–1924); Віленскую (1801–1920).

У першай палове XIX ст. на азначаных тэрыторыях панавала буйнапамеснае дваранскае землеўладанне. 3,6 % буйных памешчыкаў (якія мелі больш за 500 прыгонных) валодалі 49,6 % усіх прыгонных. 16,9 % сярэдніх памешчыкаў (ад 100 да 500 прыгонных) мелі 34,6 % усіх прыгонных, а амаль 80 % дробных памешчыкаў (да 100 прыгонных) валодалі 15,8 % ад агульнай колькасці прыгонных сялян.

Да найбуйнейшых гаспадарак у першай палове XIX ст. адносіліся: гомельскі маёнтак М.П. Румянцава (з 1835 г. графа І.Ф. Паскевіча). У 13 уласнапанскіх гаспадарках (фальварках) мелася за 60 тысяч дзесяцін толькі ворнай зямлі і 28 тысяч прыгонных сялян [1]. Маёнтак Дуброўна князя Ф.К. Любамірскага ў Аршанскім павеце (16 фальваркаў, 11 тысяч прыгонных, 22 тысячы дзесяціны ворнай зямлі) [2]. Маёнтак Хоцімск памешчыка І.А. Гальшанскага ў Клімавіцкім павеце (9 фальваркаў, 7,5 тыс. прыгонных і 40 тыс. дзесяцін ворнай зямлі).

На тэрыторыі Беларусі было больш за 50 такіх гаспадарак, дзе налічвалася больш за 2 тыс. прыгонных сялян. Але зямельныя магнаты нярэдка аддавалі перавагу сярэднім маёнткам з колькасцю прыгонных ад 200 да 500. У князя Л.Н. Віттейнштэйна, які валадарыў у 12 паветах (каля 1,2–1,3 млн дзесяцін зямлі і ад 40 да 120 тыс. душ), толькі ў 6–7 са 100 маёнткаў мелася больш 2 тыс. прыгонных [3]. Большасць памешчыкаў не мелі ўласнай гаспадаркі. Прыдатная для апрацоўкі панская зямля была ў карыстанні прыгонных сялян, якія плацілі памешчыкам аброк (грашовы або натуральны).

У першай палове XIX ст. намеціўся значны рост попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю ў Заходняй Еўропе і ў гарадах Расіі. Паколькі прадукцыя фальваркаў прызначалася на продаж і вялася на аснове паншчыны, памешчыкі паскорылі стварэнне новых фальваркаў за кошт скарачэння сялянскіх надзелаў. Сяляне і пераводзіліся з аброку на паншчыну для апрацоўкі фальваркавых зямель.

Да 1859 г. у маёнтках сярэдніх і буйных памешчыкам у цэлым на Беларусі фальваркі займалі 65 % ворнай зямлі: у Мінскай губерні – 56 %, Магілёўскай – 65 %, Віцебскай – 63 %.

У выніку сялянскае землекарыстанне скарачалася і расла колькасць беззямельных сялян. У 5 заходніх губернях надзённыя сялянскія землі складалі толькі 26,6 % ад агульнай колькасці.

Асноўны даход 78 % памешчыкаў давала земляробства (вырошчванне жыта, аўса, ячменю). Астатняя доля паступала ў выглядзе аброку, арэнднай платы, а таксама ад прадуктаў жывёлагадоўлі, тавараў, якія вырабляліся на вотчыных прамысловых прадпрыемствах. У 30–40-я гг. XIX ст. вызначаецца спецыялізацыя памешчыцкіх гаспадарак па перапрацоўцы зерня і бульбы на спірт. На тэрыторыі Беларусі дзейнічалі больш 6 тыс. вінакурняў, прыбыткі ад продажу гарэлкі пастаянна павялічваліся. У многіх памешчыкаў яны складалі да 40 % ад агульнай сумы прыбыткаў.

Актыўна развіваліся прадпрымальніцкія гаспадаркі прыгоннага тыпу ў сувязі з ростам попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю. У цэнтральнай і паўднёвай частцы Беларусі з 30-х гг. пачалі сеяць цукровыя буракі і адкрываліся цукраварныя заводы. На поўначы Беларусі, Магілёўшчыне і Міншчыне пашыралася

льноводства. На Гродзеншчыне актыўна сталі займацца танкарунннай авечкагадоўляй.

Але шматгалінных прадпрымальніцкіх гаспадарак, прадукцыя якіх вывозілася не толькі на мясцовыя рынкі, але і за мяжу (Маскву, Пецярбург, Рыгу, на Украіну) было мапа. Перш за ўсё такімі можна было лічыць гаспадаркі, у якіх выкарыстоўваліся малацілкі, веялкі, сеялкі, сячкарні, жалезныя плугі. У асноўнай масе зямля апрацоўвалася старым інвентаром прыгонных сялян без усякай агратэхнікі. Пануючай сістэмай земляробства заставалася трохполле. Гаспадаркі дробных памешчыкаў у пераважнай большасці мелі натуральны характар.

Аснову гаспадаркі селяніна складаў зямельны надзел, які ён атрымліваў ад дзяржавы або памешчыка, пры ўмове адбывання пэўных павіннасцей. Да 1842 г. колькасць памешчыцкіх сялян складала 79,8 %, а дзяржаўных – 9,3 %. Нязначны працэнт складалі вольныя людзі. К 1845 г. колькасць памешчыцкіх сялян зменшылася да 64,6 %, а дзяржаўных павялічылася да 19,1 %. Гэта акалічнасць тлумачыцца тым, што за ўдзел у паўстанні 1831–1832 гг. маёнткі шляхты канфіскоўваліся і раздаваліся «прыродным расійскім памешчыкам».

Сялянскія павіннасці вызначаліся як галоўныя і дадатковыя. У лік галоўных уваходзілі паншчына, аброк, згоны. Нормы паншчыны фіксаваліся ў інвентарах, але часта парушаліся памешчыкамі ў большы бок. К сярэдзіне XIX ст. сяляне за карыстанне адной валокай зямлі (каля 22 дзесяцін) павінны былі адбываць 12 дзён у тыдзень (па 6 дзён мужчынскай і жаночай працы). Пры меншым надзеле паншчына адпаведна памяншалася. У пасяўны перыяд і ў час уборкі ўраджаю практыкаваліся прымусовыя выхады ўсіх працаздольных сялян на панскія работы (згоны). Гэта безумоўна значна ўскладняла сялянам магчымасці развіцця ўласных гаспадарак.

Да дадатковых павіннасцей адносілася выкарыстанне сялянскай працы на будаўніцтве і рамонту панскіх пабудоў, дарог, мастоў, перавозка грузаў, начная варта і інш. У неўраджайныя гады памешчыкі часта аддавалі сваіх сялян на будаўнічыя работы, прычым у далёкія раёны (напр. Прыуралле). Зaробленыя сялянамі грошы забіралі сабе. Адрыў сялян ад сваіх гаспадарак на доўгі час садзейнічаў заняпаду апошніх.

У дакладзе генерал-губернатара Смаленскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў Ігнацьева цару ў 1855 г. гаварылася аб масавым абнішчанні прыгоннага сялянства і вызначаліся прычыны гэтага заняпаду ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. «... Маючы ад сялян розныя, ні якому ўліку не падлягаючыя выгады, многія памешчыкі забіраюць сабе ўсе заробленыя сялянамі грошы. Уладальнікі паштовых станцый набіраюць кучараў з ліку сваіх сялян, але не плацяць за працу, даюць толькі адзенне, а сем'і прымушаюць адбываць баршчыну за іх [4; с. 199].

Усё большая колькасць сялян была не ў стане выконваць павіннасці. Памешчыкі за гэта маглі пазбавіць іх зямельнага надзелу, аддаць у рэкруты і г. д.

Казённыя сяляне пакутвалі ад свавольства арандатараў, паколькі дзяржаўныя маёнткі здаваліся ў арэнду мясцовай шляхце. Арандатары ж імкнуліся выкарыстаць любыя магчымасці для атрымання прыбытку і пастаянна павялічвалі павіннасці сялян. Па гэтай прычыне і дзяржаўныя маёнткі прыходзілі ў заняпад, а сяляне не маглі плаціць падаткі.

Аб стане сялянскіх гаспадарак можна меркаваць з наступнага дакумента: «... Шматлікія памешчыкі беларускія ставяцца да сялян, як да матэрыяльна вытворчых сіл. Невялікія выключэнні не маюць уплыву на агульны стан. ...Амаль паўсюдна існуе звычай, пасля збору з палёў і агародаў сялянамі хлеба, забіраць у іх увесь ураджай і звозіць яго на панскі двор, прадстаўляючы сялянам магчымасць харчавацца гароднінай; а са снежня ці студзеня пачынаюць з узятага хлеба выдаваць гарнцы жыта, змешанага з аўсом і ячмянём па колькасці працоўных душ; тыя хто не працуе харчуюцца хто чым хоча. Паняцце аб уласнасці, амаль страчана. Зіма, вясна і лета праходзяць у пастаяннай працы і галодных пастах. Увосень селянін лічыць сябе шчаслівым, калі яму ўдаецца ўкрасці з уласнага поля некалькі снапоў хлеба [4; с. 198–199].

У 1844–1846 гг. амаль на ўсіх рэгіёнах Беларусі былі неўраджаі, якія суправаджаліся гібеллю хатняй жывёлы. Менавіта на гэтыя гады прыпадаюць хваляванні сялян, якія адмаўляліся ад выканання павіннасцей. Масавымі яны былі зафіксаваны ў красавіку 1847 г. у Віцебскай губерні і ахапілі дзесяткі населеных пунктаў і сотні ўдзельнікаў. Для спынення хваляванняў былі задзейнічаны воінскія каманды [4, с. 20–203]. У 1856–1858 гг. масавыя выступленні супраць прыгону адбыліся ў 24 маёнтках, а з 1858 па 1860 гг. – у 42. З іх 11 былі падаўлены вайскоўцамі і паліцыяй. Усім было зразумела, што прыгоннае права – гэта парахавы склеп пад

дзяржавай. Канчаткова прымусілі Аляксандра II паскорыць правядзенне сялянскай рэформы не толькі крызіс феадальна-прыгонніцкага ладу і палітычныя супярэчнасці ў краіне, а таксама паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі і паражэнне Расіі ў Крымскай вайне.

У студзені 1857 г. быў створаны Сакрэтны камітэт «для абмеркавання мер быту памешчыцкіх сялян», пад старшынствам князя А.П. Арлова. Гэта быў дзесяты па ліку камітэт па сялянскім пытанні. Ініцыятыву ў справе падрыхтоўкі рэформы ўзялі на сябе памешчыкі Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губерняў. Чуткі аб блізкай «волі» турбавалі вёску і былі стымулам шматлікіх непадпарадкаванняў сялян памешчыкам. Падпісанне «Палажэнняў аб сялянах, якія выходзяць ад прыгоннай залежнасці адбылося 19 лютага 1861 г. [5].


Літаратура і крыніцы

1. Сімакоў, с. Румянцаў / С. Сімакоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч [і інш.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993 – 2001. – Т. 6. – Кн. 1: Пузелі – Усая. – 2001. – С. 132–133.
2. Насевіч, В. Дуброўна / В Насевіч / Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч [і інш.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993 – 2001. – Т. 3: Гімназіі –Кадэнцыя / Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 1996. – С. 310.
3. Конан, У.М. Вітьгенштэйны / У.М. Конан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч [і інш.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993 – 2001. – Т. 2: Беліцк – Гімн / Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – 1994. – С. 306.
4. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 3 т. / пад. рэд. Н.М. Нікольского [і інш.]. – Мінск: Выд. АН БССР, 1936 – 1953. – Т. 2: 1772 – 1903 гг. – 1940. – 938 с.
5. История России XIX – начала XX в. – М.: «В ИТРЭМ», 2002. – С. 172–175.


## РАМЕСНАЯ І ДРОБНАТАВАРНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ У БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.


***Лютая А.Э., дацэнт, БДПУ, г. Мінск***
***Люты А.М., прафесар, БДПУ, г. Мінск***


Для перыяду развіцця феадалізму найбольш характэрным з'яўляецца аб'яднанне патрыярхальнага землеўладання з хатняй прамысловасцю ў выглядзе дробных сялянскіх промыслаў. Выраб тканіны, адзення, абутку, прадметаў быту і прасцейшых прылад працы адпавядалі законам развіцця натуральнай гаспадаркі. Тэрытарыяльнае раздзяленне працы вызначалася прыроднымі ўмовамі і крыніцамі сыравіны. Для Беларусі адносна шырокае распаўсюджванне атрымалі хатнія промыслы па апрацоўцы дрэва, валакністых рэчываў, гліны, скур і жалеза [1, с. 45]. Навейшыя даследаванні даказваюць устойлівасць большасці хатніх промыслаў на працягу ўсяго даследуемага перыяду, выпадковую, эпізадычную іх сувязь з рынкам [2]. Гэта тлумачыцца захаваннем натуральнага характару сялянскіх гаспадарак у дарэформенны перыяд. Стрымлівала развіццё хатніх промыслаў і пераўтварэнне іх у рамяство і тое, што большасць буйных феадалаў Беларусі не толькі абавязвалі сваіх сялян купляць у двары свайго гаспадара тавары шырокага спажывання, але прымушалі іх кавацца жалеза толькі ў панскіх кузнях і малоць зерне толькі ў панскіх млынах [3].

У даследуемы перыяд промысел быў непарыўна звязаны з сельскай гаспадаркай, з'яўляўся падсобным заняткам да земляробства і насіў, за невялікім выключэннем, сезонны характар. Адны промыслы былі распаўсюджаны паўсюдна (збіральніцтва, лесанарыхтоўка, кавальная вытворчасць, валянне сукна і г. д.). Іншыя існавалі толькі на вызначанай тэрыторыі: лесахімічная – Падняпроўе і Палессе, рагожны (мачальны) і шапавальства – усходняя Беларусь, нарыхтоўка запалачнай саломкі – Клімавіцкі павет Магілёўскай губерні і Мазырскі павет Мінскай губерні [2, с. 22]. У Мінскай губерні ў першай палове XIX ст. у цэлым пераважаў лясны промысел, якім акрамя мясцовага сялянства займаліся і прышэльцы з Калужскай губерні [4]. «Ва ўмовах эканамічна слаба развітога краю, – адзначаў І. Зяленскі, – памешчыкі не трэбавалі самі ці праз арандатараў займацца такімі промысламі, як выраб мачал, рагожы, гонка смалы і шкіпінару, чым у іншых мясцінах займаліся толькі сяляне» [5, с. 116]. Гэта, а таксама і тое, што прамысловыя арцелі з Калужскай губерні абавязаны былі браць харчовыя прыпасы толькі з эканоміі і частку лесу аддаваць памешчыку замест выплаты так званых пнёвых грошай, сведчыла, што феадальная ўласнасць на лес стрымлівала развіццё промыслаў. У 50-х гг. XIX ст. у Беларусі апрацоўка дрэва паступова скарачалася, што было выклікана, на думку таго ж І. Зяленскага,